*УДК 329.1./6:32*

# СТАНАЎЛЕННЕ ПАРТАЛОГІІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

**М. С. Мамекін**

*Старший преподаватель кафедры политологии юридического факультета БГУ, Минск, Беларусь, mafakoff23@mail.ru*

Палітычныя партыі і партыйныя сістэмы выклікаюць цікавасць даследчыкаў на працягу многіх стагоддзяў. Узрастанне ролі палітычных партый у палітычным працэсе прывяло да фарміравання міждысцыплінарнай галіны навуковых ведаў – тэорыі паліытчных партый і партыйных сістэм. Парталогія актыўна развіваецца і атрымлівае агульнае прызнанне на Захадзе ў сярэдзіне 1950-х гг. У савецкай жа навуцы парталогія не атрымлівае належнага развіцця, бо партыі доўгі час разглядаюцца праз прызму марксісцка-ленінскай тэорыі. Дэмакратызацыя палітычнага жыцця ў канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. прывяла да ўзнікнення некалькіх дзясяткаў палітычных партый і сотняў грамадскіх арганізацый ды рухаў у нашай краіне. Перад навуковай супольнасцю незалежнай Беларусі паўстае складаная задача па стварэнні айчыннай парталогіі ва ўмовах фактычнай адсутнасці тэарэтыка-метадалагічных традыцый даследавання палітычных партый.

***Ключавыя словы:*** тэорыя палітычных партый і партыйных сістэм; парталогія; палітычная партыя; партыйная сістэма.

# THE FORMATION OF PORTOLOGY IN THE REPUBLIC OF BELARUS

**M. S. Mamekin**

*Senior Lecturer, Department of Political Science, Faculty of Law, BSU, Minsk, Belarus, mafakoff23@mail.ru*

Political parties and party systems have been of interest to researchers for many centuries. The increasing role of political parties in the political process has led to the formation of an interdisciplinary branch of scientific knowledge – the theory of political parties and party systems. Partology was actively developing and gaining general recognition in the West in the mid-1950s. In Soviet science, however, partology does not receive proper development, since parties have long been viewed through the prism of Marxist-Leninist theory. The democratization of political life in the late 1980s and early 1990s led to the emergence of several dozen political parties and hundreds of public organizations and movements in our country. The scientific community of independent Belarus faces a difficult task of creating a national partology in the conditions of the actual absence of theoretical and methodological traditions of the study of political parties.

***Keywords:*** theory of political parties and party systems; partology; political party; party system.

Тэорыя палыытычных партый і партыйных сістэм, ці парталогія [1, с. 7] – гэта міждысцыплінарная вобласць навуковых ведаў, якая вывучае агульныя заканамернасці ўзнікнення і развіцця палітычных партый і партыйных сістэм, асаблівасці арганізацыйнага ўладкавання палітычных партый, механізмы фарміравання і функцыянавання палітычных партый і партыйных сістэм, іх месца і ролю ў грамадска-палітычным жыцці, формы ўзаемаадносін партый з іншымі палітычнымі і сацыяльнымі інстытутамі.

Міждысцыплінарны характар парталогіі абумоўлены тым, што палітычныя партыі і партыйныя сістэмы з’яўляюцца прадметам даследавання самых розных навук.

У межах гістарычнай навукі палітычная партыя разглядаецца як гістарычна з’ява, узнікненне і развіццё якой абумоўлена канкрэтнымі гістарычнымі ўмовамі. Гістарычная навука вывучае рэтраспектыўны аспект ўзнікнення, функцыянавання і наступнай эвалюцыі палітычных партый у сучасныя формы партыйнай арганізацыі. У межах гістарычнай навукі адбываецца вывучэнне абставінаў, якія абумовілі фактары стварэння палітычных партый, а таксама змяненняў у іх арганізацыі і палітычнай дзейнасці, што дазваляе выявіць генетычныя прычыны сучасных працэсаў, якія адбываюцца ўнутры партый і на міжпартыйным узроўні.

Юрыдычная навука акцэнтуе ўвагу на вывучэнні пытанняў прававога статусу палітычных партый, асноўных напрамкаў і формаў іх прававой канстытуцыяналізацыі і інстытуцыяналізацыі, механізмаў прававога рэгулявання іх дзейнасці, удзелу ў выбарах і рэферэндумах, у працы органаў дзяржаўнай улады. У межах юрыдычнай навукі праводзіцца аналіз палажэнняў заканадаўства аб палітычных партыях, яго ўздзеяння на працэс стварэння і функцыянавання палітычных партый і развіцця партыйнай сістэмы, выпрацоўваюцца рэкамендацыі па яго ўдасканаленні, устараненні супярэчнасцей і прававых прабелаў, таксама залішняй прававой рэгламентауцыі дзейнасці палітычных партый.

Вывучэнне палітычных партый таксама з’яўляецца адным з найважнейшых напрамкаў палітычнай навукі. Паліталогія даследуе і выяўляе заканамернасці ўзнікнення і развіцця палітычных партый і партыйных сістэм, механізм узаемадзеяння палітычных партый з органамі дзяржаўнай улады, дынаміку і прычыны ўзнікнення партыйна-палітычных кааліцый, асновы ўнутранага ўладкавання палітычных партый і практыку іх парламенцкай і ўрадавай дзейнасці.

Палітычная сацыялогія таксама вызначае партыі і партыйныя сістэмы ў якасці аб'екта даследавання, вывучаючы ўздзеянне разнастайных сацыяльных структур на ўзнікненне і функцыянаванне палітычных партый і палітычных сістэм, а таксама адваротны ўплыў дзейнасці партый на грамадскія адносіны. Асобныя аспекты дзейнасці палітычных партый вывучаюцца ў тым ліку ў межах іншых сфер навуковага мыслення – палітычнай псіхалогіі, канфліктaлогіі і г.д.

Міждысцыплінарны характар парталогіі патрабуе садзейнічання прадстаўнікоў розных навук. Да ліку навукоўцаў, якія зрабілі значны ўнёсак для станаўлення парталогіі ў суверэннай Беларусі могуць быць аднесены самых розных сфер навуковага мыслення, сярод якіх: доктар гістарычнык навук Бабкоў У. А., доктар гістарычных навук Лаўрыновіч Д. С., доктар гістарычнык навук Каршук У. К., доктар гістарычных навук Кузняцоў М.В., кандыдат гістарычных навук Бадулін А. П., кандыдат гістарычнык навук Дашкевіч А. Л., кандыдат гістарычнык навук Ермашкевіч Р. І., кандыдат гістарычнык навук Жылінская І. У., кандыдат гістарычнык навук Казак А. Г., кандыдат гістарычнык навук Романоўскі І. Ф., кандыдат гістарычных навук Самахвалаў Д. С. ; доктар юрыдычных навук Чудаков М. Ф., кандыдат юрыдычных навук Вашкевіч А. Я.; доктар палітычных навук Рашэтнікаў В.С., кандыдат палітычных навук Шэндзік Т. А., кандыдат палітчыных навук Лемяшова Т.У., кандыдат філасофскіх навук Салавей Т.Г.; доктар сацыялагічных навук Катляроў І.В інш.

Закладанне перадумоваў фарміравання айчыннай парталогіі звязана з трансфармацыйнымі працэсамі, якія пачалі адбывацца ў савецкім дзяржавазнаўстве ў 1970-1980-я гг. Менавіта ў гэты перыяд стала відавочным, што савецкае дзяржавазнаўства, што грунатвалася на падмурку марксісцка-ленінскай тэорыі, павінна правесці своеасабліваую "рэвізію" досведу ўласнага вывучэння палітычных партый [2, с. 141]. Падобная рэвізія патрабавала выканання савецкімі навукоўцамі наступных задач: крытычнага пераасэнсаванне вынікаў працы некалькіх пакаленняў дасавецкіх, савецкіх і замежных навукоўцаў пачатку XX ст., а таксама вызначэння новых шляхоў вывучэння праблематыкі палітычных партый. Такім чынам, намаганні савецкіх навукоўцаў павінны былі быць накіраваная на вывучэнне і распрацоўку тэорыі і метадалогіі паследавання палітычных партый праз асэнсаванне спадчыны класічай заходняй парталогіі. У якасці ж аднаго з новых напрамкаў даследавання партый павінна было стаць вывучэнне асаблівасцей і непаўторнасці працэсу фарміравання палітычных партый, што дзейнічалі на тэрыторыі Расійскай імперыі.

Другая палова 1980-х гг., для якой стала ўласцівым зацверджанне прынцыпаў тэарэтычнага і метадалагічнага плюралізму ў спалучэнні са зменамі ў сацыяльна-палітычным жыцці СССР, прывялі да з'яўлення новых альтэрнатыўных канцэпцый і даследаванняў палітычных партый. Фактычна ў гэты час былі закладзены асновы вывучэння палітычных партый і для беларускуай парталогіі.

У станаўленні айчыннай парталогіі можна вылучыць 4 этапы, вылучэнне якіх звязана з накіраванасцю вывучэння палітычных партый і партыйных сістэм беларускімі навукоўцамі. Напрамкі вывучэння палітычнык партый у першую чаргу былі абумоўлены асаблівасцямі рэальнай практыкі функцыянавання палітычных партый у Беларусі.

З 1991 па 1994 гг. цягнуўся першы этап, які можна вылучыць у станаўленні тэорыі партый і партыйных сістэм. Менавіта ў гэты час беларускія навукоўцы сталі на шлях стварэння айчыннай парталогіі. Адбылося актыўнае вывучэнне і даслеванне асноваў заходнееўрапейскай парталогіі, перайманне замежнага досведу. У гэты перыяд ўпершыню складаліся і апрабаваліся навучальныя курсы і праграмы па праблематыцы палітычных партый і партыйных сістэм.

З 1994 па 2010 гг. – другі этап развіцця парталогіі ў Беларусі. Значныя змены, што адбываюцца ў Рэспубліцы Беларусь (прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь; прыняцце першага спецыяльнага нарматыўнага прававога акта, які ўрэгуляваў асобныя бакі дзейнасці палітчыных партый – Закона "Аб палітычных партыях Рэспублікі Беларусь"; узнікненне ў межах партыйнай сістэмы рэальна дзеючых палтітычных партый, прадстаўленых у парлменце; расколы і аб'яданні палітычных партый; наступныя змены заканадаўства – выданне Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 студзеня 1999 г. "Аб некаторых мерах па ўпарадкаванні дзейнасці палітычных партый, прафесійных саюзаў і грамадскіх аб'яднанняў"; некалькі перарэгістрацый партый, трансфармацыя палітычныай сістэмы г.д.) прыводзяць да неабходнасці вывучэння айчыннымі навукоўцамі фактараў станаўлення і асаблівасцей функцыянавання партыйнай сістэмы Беларусі. Вывучэнне дзейнасці партый і фукцыянавання партыйных сістэм, як і належыць, ажыццяўляецца прадстаўнікамі розных навук: палітолагамі, юрыстамі, гісторыкамі, сацыялогамі. На падставе ўласнага практычынага досведу функцыянавання партый ажыццяўляецца выпрацоўка заканамернасцей развіцця партыйнай сістэмы, яе асаблівасцей; праводзяцца параўнальныя даследаванні. У гэты час з'яўляюцца не толькі тэарэтычныя, але і некаторыя прыкладныя даследаванні дзейнасці палітычных партый.

Трэці этап ахоплівае перыяд часу з 2011 па 2022 гг. Нягледзячы на тое, што даследаванні палітычных партый і партыйных сістэм

працягваюцца, змены ў межах партыйнай сістэмы і паступовы заняпад інстытута партый у Беларусі, які распачынаецца прыблізна з 2000 года, непазбежна прыводзяць да падзення даследчыцкай цікавасці да прамлематыкі палітычных партый. Большасць публікацый, што з'яўляюцца на гэтым этапе маюць гістрарыяграфічны характар і акцэнтуюць увагу на спосабах і вектарах магчымай трансфармацыі партыйнай сістэмы дзеля пераадолення крызісу інстыту палітычных партый у Беларусі. Ва ўмовах нефукнцыянальнасці палітычных партый, а значыць адсутнасці неабходнага эмпірычнага матэрыялу для вывучэння, назіраецца зварот навукоўцаў да вывучэння новых даследаванняў партолагаў свету, у якіх аналізуюцца асноўныя тэндэнцыі развіцця і трансфармацыі палітычных партый сучаснасці. Аданак усё ж на гэтым этапе назіраецца падзенне навуковай цікавасці да вывучэння партый, таму парталогія не атрымлівае далейшага развіцця.

Чацвёрты этап развіцця парталогіі ў Беларусі пачынаецца з 2023 г. На сённшні дзень яго вылучэнне бачыцца ўмоўным, аднак пасля правядзення рэферэндуму ў 2022 г., надання Усебеларускаму народнаму сходу канстытуцыйнага статуса, прыняцця законаў "Аб асновах грамадзянскай супольнасці" і "Аб змяненні законаў па пытаннях дзейнасці палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў" і перарэгістрацыі палітычных партый партыйнай сістэма Беларусі прыцярпела значныя змены. У партыйным полі засталіся толькі 4 паліытчныя партыі, аднак упершыню з 1990-х гг. партыі значна прадстаўлены ў парламенце, а партыйная дзейнасць атрымала новых подых. Гэтыя змены могуць прывесці ў тым ліку да пераасэнсавання навуковай супольнасцю неабходнасці вывучэння тэорыі палітычных партый і партыйныйх сістэм ды аднаўлення даследчыцкай увагі да вувычэння палітычных партый, а новыя даследаванні ўжо пачынаюць з'яўляцца [3].

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Основы теории политических партий: учеб. пособие / С. Е. Заславский и [др.]; под ред. С. Е. Заславского. М.: «Европа». 2007. 264 с

2. *Шелохаев В. В., Соловьёв К. А.* Политические партии России в начале XX в. как историографическая проблема // Российская история. 2021. Вып. 1. С. 139–150.

3. *Шендик Т. А.* Партийное строительство в Беларуси: сущность, предпосылки, технологии. Минск : РИВШ, 2023. 208 с.